# Пімен Панчанка



Пімен Емяльянавіч Панчанка нарадзіўся 23 жніўня 1917. Паходзіў з Ашмяншчыны, але нарадзіўся ў Таліне, куды з вёскі Гедэйкі ў пошуках працы прыехалі яго бацька Емяльян Арцёмавіч і маці Дар'я Факееўна.

Пімен Панчанка вырашыў звязаць сваё жыццё з настаўніцкай працай. У 1932 годзе пасля заканчэння Бягомльскай сямігодкі, а потым гадавых педагагічных курсаў ён пачаў працаваць настаўнікам пачатковых школ Кіраўскага раёна і адначасова паступіў вучыцца на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Мінскага настаўніцкага інстытута.

Першыя вершы Пімена Панчанкі былі надрукаваныя ў 1934 годзе ў альманаху "Ударнік". Да вайны выйшлі два зборнікі яго паэзіі "Упэўненасць" і "Вераснёвыя сцягі". Асноўныя матывы даваеннай творчасці былі тыповымі для тагачаснай літаратуры. Паэт услаўляў савецкую рэчаіснасць, працоўныя будні, гаварыў пра сваю любоў да радзімы.

У верасні 1939 года Пімена Панчанку прызвалі на вайсковую службу, і ён ішоў цяжкімі дарогамі вайны ажно да 1946 года ўключна. У 1944 годзе Пімен Панчанка ў складзе 34-й арміі трапляе ў Іран. Экзатычная зямля, чужыя звычаі, побыт захапляюць паэта, ды не засланяюць у яго душы галоўнага: ён імкнецца вярнуцца на радзіму і да радзімы. Але толькі ў 1946 годзе ён змог прыехаць у Мінск і пачаць працаваць у рэдакцыі часопіса "Вожык". З гэтага часу творчае жыццё і лёс Пімена Панчанкі непарыўна звязаны з літаратурай. Ён працуе ў рэдакцыях тагачасных знакамітых літаратурных выданняў: штотыднёвіку "ЛіМ" і часопісе "Маладосць", рускамоўным альманаху "Советская Отчизна", пэўны час сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, але ніколі не пакідае паэзіі.

# Цікавыя факты

ФАКТ 1. АДКРЫТА ПРЫЗНАВАЎСЯ Ў СВАІХ ПАМЫЛКАХ

Пімен Панчанка ў вершах заўсёды шчыра выказваў свае пачуцці. Ён па-сапраўднаму верыў у камуністычныя ідэі, што не раз паказваў у сваіх пасляваенных творах. Але калі СССР пачаў “трашчаць па швах”, паэт змог сумленна прызнаць свае абмылы ў 80-я гады. Ён не пасаромеўся прызнацца, што памыляўся ў меркаваннях, што ўвесь гэты час яго вершы хлусілі — а гэта па-сапраўднаму адважны ўчынак для кожнага паэта. Такія выпадкі ў гісторыі вельмі рэдкія.

## ФАКТ 2. НЕ БАЯЎСЯ ДРУКАВАЦЬ КРАМОЛЬНЫЯ ТВОРЫ

Пэўны час Пімен Панчанка ўзначальваў часопіс «Маладосць». І пускаў у друк нават творы, якія не вельмі падабаліся Савецкай ўладзе. У 1965 годзе за тое, што надрукаваў твор Васіля Быкава «Мёртвым не баліць» быў зняты з пасады.

ФАКТ 3. ЖЫЎ У ПОЎНЫМ БЯЗГРОШ’І

У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў Народны паэт Беларусі Пімен Панчанка жыў у вельмі цяжкіх матэрыяльных абставінах. Развальваўся Савецкі Саюз і дапамогі чакаць не было адкуль. Але калі іншыя пісьменнікі яшчэ неяк прыстасаваліся ды сточвалі канцы з канцамі, то для Панчанкі гэты перыяд стаў вельмі цяжкім у матэрыяльным плане. З-за поўнага бязгрош’я пра яго нават стала хадзіць прымаўка ў народзе «З усіх народных паэтаў Пімен Панчанка — «самы» народны. Бо па сваім матэрыяльным становішчы знаходзіцца бліжэй за ўсіх да народа».

Другая палова 80-х — пачатак 90-х гг. былі ў жыцці паэта ці не самымі цяжкімі. Даймалі шматлікія хваробы. Ён амаль што не выходзіў з бальніцы. Пачаліся і матэрыяльныя нястачы. Найбольш мучыў душэўны боль. У творчасці паэта ўзмацніліся публіцыстычнасць, палемічная вастрыня, сатырычны пафас. Вершы грамадзянскага гучання склалі зборнікі "І вера, і вернасць, і вечнасць" (1986), "Прылучэнне" (1987), "Горкі жолуд" (1988), "Неспакой" (1988), "Высокі бераг" (1993). Вялікі грамадзянскі рэзананс выклікала ў свой час "Паэма сораму і гневу»

Пасля смерці паэта (2 красавіка 1995 г.) з друку выйшлі яго кнігі "Зямля ў мяне адна" (1996) і "Жытнёвы звон" (2002), у якіх сабраны творы розных гадоў.